УДК 821.161.3.09

**Борбат Таццяна Іванаўна**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)
borbat_ti@m.msu.by

**Ячмянёва Ірына Мікалаеўна**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)
iachmenyova@m.msu.by

# МАСТАЦКАЕ АСЭНСАВАННЕ ТЭМЫ “ВАЙНА І ДЗЕЦІ” Ў МАЛОЙ ПРОЗЕ ІВАНА ЧЫГРЫНАВА

У артыкуле на аснове аналізу апавяданняў І. Чыгрынава са зборнікаў “Птушкі ляцяць на волю”, “Самы шчаслівы чалавек”, “Ішоў на вайну чалавек” вызначаецца іх мастацкая адметнасць, вылучаецца праблемна-тэматычнае кола; адзначаюцца асаблівасці адлюстравання і асэнсавання тэмы “вайна і дзеці”.

**Ключавыя словы:** мастацкае асэнсаванне, змаганне, акупацыя, чалавек на вайне, вайна і дзеці, сумленне, шчасце, чалавечнасць

Based on the analysis of I. Chigrinov’s stories from the collections “Birds Fly Free,” “The Happiest Man,” and “A Man Went to War,” this article identifies their artistic features, highlights their thematic scope, and examines the portrayal of the theme of “War and Children.”

**Keywords***:* artistic interpretation, struggle, occupation, man in war, War and Children, conscience, happiness, humanity

Іван Чыгрынаў належаў да пакалення пісьменнікаў, што называюць філалагічным ці “дзецьмі вайны”, у творчай спадчыне якога шырока прадстаўлена тэма Вялікай Айчыннай вайны. Найбольш значныя дасягненні пісьменніка ў літаратуры звязаны менавіта з адлюстраваннем і асэнсаваннем



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

подзвігу і трагедыі беларускага народа ў ваенны час. Сярод іх – апавяданні “Ішоў на вайну чалавек”, “За сто кіламетраў на абед”, “Апавяданне без канца”, “Самы шчаслівы чалавек”, “Плывун”, “Птушкі ляцяць на волю”. У гэтых і іншых творах адбіўся асабісты вопыт пісьменніка, бачанае ім, перажытае.

Асаблівасцю станаўлення творчай індывідуальнасці І. Чыгрынава, як слушна адзначаюць Т. Грамадчанка [1], А. Марціновіч [2], з’яўляецца непрацяглаincome вучнёўскага перыяду. Ужо раннія апавяданні пісьменніка былі сур’ёзным і ўдумлівым словам пра жыццё чалавека, вылучаліся высокім мастацкім узроўнем. Малады аўтар “праз знешнюю дынаміку сюжэта здолеў стварыць жывыя характары”, праўдзіва паказаць абставіны, у якіх дзейнічаюць героі (апавяданні “Праз гады”, “Апавяданне без канца”, “У матчынай хаце”, “Ля вогнішча” і інш) [1, с.13]. Пісьменнік падрабязна не даследуе рух пачуццяў, эмоцый, перажыванняў герояў, акцэнтуючы ўвагу толькі на асобных дэталях, якія і даюць уяўленне пра душэўны стан персанажаў. І разам з тым апавяданні І. Чыгрынава вызначаюцца псіхалагічнай напружанасцю.

Псіхалагічная напружанасць заўважаецца і ў апавяданні “Бульба” (першапачатковая назва “Ля вогнішча”), якім пачынаецца першая кніга І. Чыгрынава “Птушкі ляцяць на волю”. У аснове твора – асабіста перажытае і ўбачанае. Аўтар згадвае пра маленства, апаленае пажарам вайны. У аснове твора – радасная падзея – вызваленне вёскі ад фашысцкіх рабаўнікоў. Распавядаючы пра ўпартыя баі на Бесядзі, аўтар пазбягае паказу батальных сцэн, тым не менш ён змог перадаць жорсткасць і зацятасць баёў, сказаць пра вялікія страты, якія несла наша войска на шляху вызвалення роднай зямлі. Гэтага дасягае пісьменнік з дапамогай эмацыянальна-ўражлівых дэталяў і вобразаў, што назаўжды захаваліся ў памяці: *“На цёмна-зялёнай траве шырокага заліўнога лугу, што быў паміж лесам і Бесяддзю, з кожнай новай атакай большала трупаў з пасінелымі тварамі <...>. Па-ранейшаму паўз школу рухаліся к Бесядзі войскі. А адтуль, пачынаючы з самае раніцы, везлі на машынах раненых. Вясковыя бабы падыходзілі паглядзець на іх і пасля плакалі”* [3, с. 37 – 38]. Героі апавядання – Мішка Бычыхін, Санька Брылёў і герой-апавядальнік – вядуць гаворкі з воінамі. Асабліва прыкіпелі душой падлеткі да старшага лейтэнанта. Аднак пачалося наступленне і вайсковец ужо не вярнуўся: *“Мы цярпліва сядзелі каля вогнішча і чакалі старшага лейтэнанта. У нас была напагатове для яго печаная бульба. Але старшы лейтэнант не прыйшоў...”* [3, с. 38].

На старонках твораў І. Чыгрынава паўстае суровая і трагічная праўда ваеннага часу, які і дарослых, і дзяцей зрабіў аднолькава сур’ёзнымі, засяроджанымі ў сабе. Найбольшую каштоўнасць у такіх абставінах набываюць дабрыня, спагадлівасць, чалавечнасць, якія выяўляюцца нават у прыватных дробязях. Так, у апавяданні салдаты не вымаўляюць гучных слоў, не робяць нешта асаблівае. Іх размовы, учынкі звычайныя: яны кормяць дзяцей салдацкай кашай, дораць рыжаму Саньку шапку, аднак колькі за гэтым адчуваецца дабрыні, бацькоўскай ласкі, якой так не ставала хлапчукам. Твор падкупляе сваёй шчы-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

расцю і непасрэднасцю. Перад чытачом не проста ўласныя ўспаміны пра перажытае ў дзяцінстве, на старонках твора — суровая праўда ваеннага часу.

У большасці апавяданняў І. Чыгрынава героямі з'яўляюцца "дзеці вайны". Гэта яны, дарослыя ў сучаснасці, зноў перажываюць мінулае, сваёй памяццю вяртаюцца ў тыя пякельныя дні, альбо ў самыя галодныя часы адразу пасля вызвалення родных мясцін. Паказальным у гэтым плане з'яўляецца апавяданне "За сто кіламетраў на абед", якое пачынаецца агульнай характарыстыкай "дзяцей вайны": *"Нам было ў той час па дзесяць гадоў — адным трохі болей, другім трохі меней. І мы былі дзеці вайны. Але мы тады амаль усё ведалі, і мне часам здаецца, што ведалі куды больш, чым нават цяпер, калі нам па трыццаць ужо. Напрыклад, мы без памылкі маглі яшчэ на падлёце пазнаць па гуку самалёты — "нашы" і "не нашы". Ведалі, якія кулі ў што пафарбаваны — звычайныя, разрыўныя, бронеразрыўныя, бранябойныя, трасіруючыя... <...>"* [3, с. 77]. Дзеці па гуку маглі вызначыць свае і чужыя самалёты, былі самастойныя і рашучыя, не пабаяліся за сто кіламетраў адпраўляцца на абед у дзіцячы дом, дзе кармілі смачным, як ім здавалася, абедам. *"А галодныя мы, —* гаворыць пра сваіх равеснікаў пісьменнік, *— здаецца, былі заўсёды: то харчу не хапала, то солі (не пасаліўшы — не з'ясі), то яшчэ якой трасцы <...>. Як заходзіў год за год, так і голад за голадам ішоў"* [3, с. 77 – 78].

Кожны эпізод апавядання мае пэўную сэнсавую нагрузку, глыбока хвалюе: як савецкія салдаты дзяліліся ежай з жыхарамі вёскі, як адносіліся дзеці да круглага сіраты Ваські Карапета, як дырэктар дзіцячага дома Іван Мікітавіч, інвалід вайны, які, нават разгадаўшы хітрыкі дзяцей, не стаў крычаць на хлапчукоў ці павучаць, толькі з папрокам сказаў: *"– Ну, што вы расселіся тут? Ідзіце абедаць!"* [3, с. 50]. Інакш ён не мог паступіць. Па асобных дэталях чытач здагадваецца, што і ў дзіцячым доме дзеці таксама галадаюць.

Да тэмы "вайна і дзеці" І. Чыгрынаў звяртаецца і ў апавяданнях "На пыльнай дарозе", "Плывун", якія ўключаны ў другі зборнік апавяданняў "Самы шчаслівы чалавек". У творах псіхалагічна пераканальна паказаны характары і паводзіны дзяцей у суровы ваенны час. Напрыклад, да глыбіні душы кранае сцэна развітання Антона Шасцярнёва з малым сынам Васільком (апавяданне "На пыльнай дарозе"). Хлопчыка не змаглі перад гэтым дабудзіцца. Не паспеў Шасцярнёў адысціся ад хаты, як пачуў крык сына, які даганяў бацьку. *"Нарэшце падбег, задыханы, спыніўся і з вачамі, поўнымі слёз, выцягнуў перад сабой сціснуты кулачок. – Што ты, сынок? Хлопчык раскамечыў кулачок, і тады на яго вузенькай далоні Антон Ягоравіч заўважыў блішчасты вінтовачны патрон з белай куляй, на самай дзюбачцы якой былі два цёмныя паяскі. – Вазьмі, – сказаў хлопчык. – Гэта я... утаіў... Дастаў з тваёй кайстры і ўтаіў..."* [3, с. 136]. Пісьменнік здолеў надзвычай дакладна і тонка перадаць светаадчуванне дзіцяці. Васілёк даганяў бацьку не дзеля развітання, а каб аддаць патрон, які спатрэбіцца яму на вайне. Гэты патрон Шасцярнёў амаль



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

усю вайну пранасіў у кішэні, бярог "на апошні выпадак", які, на шчасце, не надарыўся.

Як і ў іншых творах, ваенная рэчаіснасць у апавяданні паказваецца рэтраспектыўна, праз успаміны Антона Шасцярнёва падчас сустрэчы з ужо дарослым сынам. Ключавыя моманты апавядання – пранікнёна-эмацыянальныя сцэны развітання з малым Васільком і сустрэча з ім у вызваленай ад фашыстаў спаленай вёсцы, ствараюць своеасаблівы элегічна-роздумны настрой, з іх дапамогай аўтар ацэньвае паводзіны галоўнага героя.

Атмасфера перадваенных і першых ваенных гадоў дакладна перададзена ў апавяданнях "Самы шчаслівы чалавек", "У баку ад дарогі", героі якіх – юнакі, захопленыя рамантыкай вайны.

Такім чынам, апавяданням І. Чыгрынава на ваенную тэму ўласціва праўдзівае бачанне складаных перыпетый ваеннай рэчаіснасці. Асэнсоўваючы тэму "дзеці і вайна", пісьменнік у сваіх апавяданнях малюе такіх не па гадах дарослых, дачасна пасталелых у дні вайны дзяцей, расказвае пра пакуты і гора, якія ім даводзілася перажыць. Для апавяданняў І. Чыгрынава на ваенную тэму характэрна няспешная апавядальная манера, глыбокі шматзначны падтэкст, увага да дэталяў. Пры раскрыцці характараў персанажаў пісьменнік па-майстэрску выкарыстоўвае такі мастацкага прыёму, як дыялог. Апавяданні прываблiваюць моцным гуманістычным пафасам, псіхалагічнай насычанасцю.

**Літаратура**

1. Грамадчанка, Т. К. Жывая памяць народа : нарыс творчасці І. Чыгрынава / Т. К. Грамадчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 112 с.

2. Марціновіч, А. А. Іван Чыгрынаў: Нарыс жыцця і творчасцті: Дапам. для настаўнікаў. / А. А. Марціновіч. – Мінск : Народная асвета, 1999. – 176 с.

3. Чыгрынаў, І. Г. Апавяданні : для ст. шк. ўзросту / І. Г. Чыгрынаў – Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. – 207 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова